ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# ЖЫВЕ У ГОМЕЛІ ТАКІ ПАЭТ

***Прадстаўляць чытачам вершы гамяльчаніна Алеся Дуброўскага для мяне асабліва прыемна. Як - ніяк, а знаёмы мы 1972 года. Менаеіта тады я стаў студэнтам гісторыка - філалагічнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, на трэцім курсе якога ў той час вучыуся Аляксандр Сцяпана- віч. Я невыпадкова назваў яго па прозвішчу, бо ён, на сем гадоў старэйшы, / сапраўды тады ўяўляўся нам, першакурснікам, накшталт бацькі. Праўда, звалі яго "Дзедам"— мо з - за вялікай лысіны, я кую прыдбаў падчас службы ў войску?***

***З лёгкай рукі Алеся гэтаксама пачаўся I мой шлях у журналістыку. Гэта ён параіў тагачаснаму рэдактару гомельскай раённай газеты "Маяк" Івану Паўлавічу Дземідзенку ўзяць мяне ў сельгасаддзел рэдакцыі, дзе, дарэчы, працаваў і сам. Ды і потым па - бацькоўску апекаваў.***

***А нарадзіўся А. Дуброўскі ў 1948 годзе ў В. целяшы Гомельскага раёна. Зараз працуе на Гомельскай студыі тэлебачання ў самым гарачым яго цэху —рэдакцыі навін. I, вядома ж, піша вершы, публікуецца ў перыядычным друку.***

***Няхай з некаторымі творамі майго земляка Алеся Дуброўскага пазнаёмяцца і чытачы газеты.***

*Анатоль ЗЭКАУ*

***Алесь ДУБРОЎСКІ***

Бацькаўшчына -
могілкі на ўзгорку,
Ластаўкі на хісткіх правадах,
Бразгаюць даёнкі
на ладворках,
Наліваюцца антонаўкі ў садах.
Водбліскі
раптоўнай навальніцы,
Дожджык з цмянай назваю
“сляпы",
Смак вады студзёнае
з крыніцы,
Туманоў надрэчныя слупы.
Яканне і цеканне ў гаворках,
Васількі у зрэнках маладзіц...
Прыгадаўшы гэта, ўпаў бы ніц
За Цябе і могілкі на ўзгорку!

***

Замардаваная зямля
маёй Айчыны,
І пладаносіць шчодра
станеш ты няздольнай,
Калі народ твой
сырамяжнаю ляйчынай
Сцябае лёс —
такі гаротны і няўмольны.
Ні вольніцы табе святой,
ні перадыху
Ў жабрачых клопатах
аб лусце паўсядзённай,
Пакуль сталіца
радзімае сквапна пыху
З кішэняю сваёй
дзіравай, ці бяздноннай.
Яе напоўніць
не падалелі вякамі
Бацькі мае
твае і іх былыя продкі
Зямля малая
няўжо цябе знарок злякалі
І здрадна кінулі
на водкуп іншародкам?
Даруй нам, Божа,
гэты іудзейскі грэх...

**ХРАМЫ**

**I**

Бубуюць храмы
ў вёсках і ў сталщах ,
Нібы не руйнавалі іх ніколі,
Бо вельмі модным стала
памаліцца,
Каб выпрасіць
у Бога лепшай долі.
Будуюць храмы
з цэглы і бярвенняў
І талакой, і ў складчыну,
і проста
З калгаснай касы
сродкі пакаленняў
Ідуць на кошт
Вялікаднага посту.
У Бабічах,
як спыніцца транзітны,
Дзябёлыя
заходзяць маладзіцы:
«Царкву заклалі —
будзе знакамітнай,
Хто веруе,
падайце на званіцу...»
Куды не йдуць
бабулькі пасланцамі,
Пералічыць я нават
не бяруся.
Такі наш лёс гаротны —
быць старцамі
На нашай
вольнай Беларусі...
Будуюць храмы
ў вёсках і ў сталіцах.
Не супраць я,
але прызнацца мушу:
Злачынцу
дастаткова памаліцца
І ён святы...
А храмы ў нашых душах!

**II**

*Міколу Мятліцкаму*

Вясной у дзень
чарнобыльскага смутку
Ад тлумных
каранованых сталіц
Яны, дарог раскручваючы
скруткі,
Вяртаюцца да родных аканіц.
На матчыных магілках
на пагостах
У Бабчыне, Пасудаве, Круках
Становяцца даступнымі
і простымі
Паэты са слязамі на шчаках.
Іх месца тут,
спагадліва прырода
Суцішыцца на некалькі хвілін,
Як загучаць зусім не прына- родна
Радкі для маці,
што чытае сын.
...Маўчаць утравянелыя
магілы
Сягонняшніх
пазбаўленыя драм...
Жанчынам,
што паэтаў нарадзілі,
Не манументы ўзводзіў бы,
а Храм!.

Стары гадзіннік
спыніцца аднойчы,
Запасы ходу
вычарпаўшы ўволю,
Затое ўдзень,
ці нават цёмнай ноччу
Імклівы час